4. Еврейско-русский и греческо-русский словарь-указатель на канонические книги Священного Писания. Спб., 2005.
5. *Грихилис Л.* Практический курс библейско-арамейского языка: учебн. пособие. М., 1998.

# ХАРАКТАР КАНФЛІКТУ ПАМІЖ КРЫШТОФАМ РАДЗІВІЛАМ «ПЯРУНОМ» І ЖЫГІМОНТАМ ІІІ ВАЗАЮ Ў АПОШНІМ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ XVI – ПАЧАТКУ XVII СТАГОДДЗЯЎ

**С. А. Ганчарэнка**

З канфлікту Крыштофа Радзівіла Пяруна з Жыгімонтам III Вазаю пачынаецца сталая канфрантацыя прадстаўнікоў біржанскай галіны роду з чарговымі манархамі з дынастыі Вазаў на троне Рэчы Паспалітай. Кульмінацыямі гэтай канфрантацыі стаў актыўны удзел сына Пяруна Януша Радзівіла ў рокашы Зебждыдоўскага 1606–1609 гг., а таксама адкрыты выступ на баку Швецыі ў 1655–1657 гг. яго ўнукаў Януша і Багуслава. Фактычна, больш за паўстагоддзя прадстаўнікі біржанскай галіны роду знаходзіліся ў апазіцыі да каралёў Рэчы Паспалітай з дынастыі Вазаў, і прычыны падобнага стану рэчаў неабходна шукаць у пачатках кіравання Жыгімонта III. Без даследавання характару адносінаў паміж Крыштофам Радзівілам і манархам немагчыма да канца зразумець прычыны заключэння Янушам Радзівілам і адданай яму шляхтай 20 кастрычніка 1655 г. знакамітай Кейданскай уніі са Шведскім каралеўствам.

У перыяд трэцяга безкаралеўя (1586–1587), насуперак пашыранаму ў гістарыяграфіі меркаванню, Крыштоф Радзівіл не з'яўляўся прыхільнікам Жыгімонта Ваза. Віленскі ваявода не спяшаўся адназначна займаць бок нейкага кандыдата, аднак найбольш спрыяў Фёдару Іванавічу. Зрэшты, выбар Жыгімонта Вазы ён сустрэў калі і не з энтузіязмам, то, прынамсі, не негатыўна [1, с. 219–226; 2, с. 261–272; 3, с. 269; 4, с. 94; 5, с. 22–23].

Аднак адносіны Крыштофа Радзівіла Пяруна з Жыгімонтам III не заладзіліся амаль ад пачатку. Як адзначаў Леў Сапега на пазіцыях Радзівіла пры двары значна адбілася яго нез'яўленне на каранацыйным сойме 1587–1588 гг. [3, с. 269]. У сваю чаргу, магчыма на паставу Пяруна аказалі ўплыў дастаткова інтэнсіўныя паведамленні Льва Сапегі аб незычлівасці Жыгімонта III да «народу літоўскага» [4, с. 187–192, 194, 198; 5, с. 36]. Адносіны паміж каралём і Крыштофам Радзівілам значна сапсаваліся, калі літвіны прамарудзілі з выдачаю каралеўскіх клейнот з Гародні [4, с. 192–193; 5, с. 31–33].

Як вынік, манарх адмовіўся надаваць слугам Крыштофа Радзівіла зямельныя ўладанні [4, с. 193]. Пярун у сваю чаргу не спяшаўся на з'езд сенатараў у Берасці, скліканым Жыгімонтам III пад час яго першага наведвання ў ВКЛ у лістападзе 1588 г. [5, с. 41]. Зрэшты там, мабыць, часова наладзіліся стасункі паміж каралём і віленскім ваяводаю. На пацыфікацыйным сойме 1589 г. Крыштоф Радзівіл быў намінаваны на ўрад вялікага гетмана. У жніўні гэтага ж году ён склаў кампанію манарху ў ягонай паездцы на кангрэс ў Рэўлі [3, с. 269; 5, с. 42; 6, с. 138]. Аднак пацяпленне было нядоўгім. Ужо на сойме 1590 г. Пярун рэзка выступіў супраць падатку на Вялікае Княства Літоўскае, што выклікала вялікую няласку Жыгімонта III. Наогул гэты сойм віленскі ваявода назваў «злачынным» і «нецнтатлівым», «якога ніколі не толькі пры нас, але і пры продках нашых не было» [3, с. 269].

Далейшае стаўленне Крыштофа Радзівіла да манарха вызначыла вядомая справа з віленскім біскупствам, якая разгортвалася ад сярэдзіны 1592 г. Найбольш заўзятым праціўнікам паляка Б. Мацяёўскага на пасадзе віленскага біскупа стаў Крыштоф Радзівіл. Ягоная пазіцыя па гэтым пытанні азмрочвала і без таго не самыя лепшыя адносіны з Жыгімонтам Вазаю, канчаткова паставіла яго ў апазіцыю да двара. На думку Льва Сапегі справа з біскупствам стала галоўным перашкодаю, якая замінала наладжванню стасункаў паміж Пяруном і Жыгімонтам III [5, с. 216].

У апошняе дзесяцігоддзе XVI ст. паміж манархам і віленскім ваяводаю перыядычна ўспыхвалі рознага маштабу канфлікты. Асаблівага накалу адносіны паміж дваром і Крыштофам Радзівілам дасягнулі ў канцы 1594–1595 гг., калі апошні перайшоў у сапраўдны наступ на манарха. Ён надзвычай негатыўна паставіўся да рашэння Жыгімонта III склікаць на люты 1595 г. сойм у Кракаве. Двор меркаваў, што ён нават імкнуўся сарваць правядзенне сойму, інтрыгуючы супраць яго ў Польшчы з арцыбіскупам С. Карнкоўскім [3, с. 270]. Больш за тое, Крыштофу Радзівілу прыпісвалі тое, што ён пастараўся аб негатыўных інструкцыях паслоў на сойм з паветаў Вялікага Княства Літоўскага [4, с. 298; 5, с. 100]. Паводзіны Пяруна падчас соймавай каманіі на самімі сойме (які ваявода віленскі праігнараваў) адкрыта называлі бунтам [3, с. 271; 5, с. 104]. Такім чынам з сярэдзіны 1590-х гг., пазіцыю Крыштофа Радзівіла да двара можна характарызаваць як выразна апазіцыйную [2, с. 275].

У адказ Жыгімонт III значна абмежаваў паўнамоцтвы Крыштофа Радзівіла як вялікага гетмана Вялікага Княства Літоўскага. Пад час бунту Налівайкі (1595–1596) ён не дазволіў Пяруну самаму выбраць ротмістраў для ротаў [5, с. 131]. Затым манарх адмовіў віленскаму ваяводзе ў прызначэнні К. Зяновіча польным гетманам, хаця ўжо раней

загадаў пісаць Л. Сапегу прывілей для яго. Урэшце, Жыгімонт III не згадзіўся па просьбе Крыштофа Радзівіла надаць урад пісара польнага блізкаму яго паплечніку П. Стаброўскаму [5, с. 137–140].

Гэтыя канфлікты прывялі да таго, што доўгі час Жыгімонт III адмаўляўся даваць сыну Пяруна Янушу Радзівілу на просьбы бацькі які-небудзь сталовы ўрад. Першыя згадкі аб спробах Крыштофа Радзівіла атрымаць намінацыю для сына адносяцца да лета 1597 г. Некалькі гадоў гэтыя спробы да поспеху не прыводзілі. Толькі вясною 1599 г. Януш Радзівіл атрымаў сталовы ўрад падчашага ВКЛ. У гетманстве польным манарх яму адмовіў [4, с. 134, 145, 151, 153, 226; 5, с. 154, 157, 184, 191–192, 216, 239].

Безумоўна, двор апасаўся наймагутнейшага ў ВКЛ магната, асабліва яго ўсё больш рэальнаму саюзу з галоўным лідарам апазіцыі ў Кароне Янам Замойскім. Для частковай нейтралізацыі пазіцый Пяруна, Жыгімонт Ваза паспрабаваў выкарыстаць канфлікт біржанскіх Радзівілаў з Хадкевічамі з-за спадчыны Алелькавічаў, у якім не адкрыта, але ўсё ж выразна спрыяў Хадкевічам [7, с. 209–210]. Цудоўна пазіцыю манарха характарызуюць наступныя яго словы: «усёй Літвой завалодаў і ёй кірую і калі б я яшчэ Хадкевічаў не падтрымліваў, падпарадкаваў бы ўсіх, але яму трэба супрацьпаставіць таго, хто бы яго на месца паставіў, калі б яму яшчэ да ўсяго Слуцк даць, то ён бы сваёй сілаю Літву апанаваўшы, захацеў бы быць князем вялікім, а потым каралём, але нічога з гэтага не будзе» [7, с. 208]. Напружанне ў адносінах паміж Жыгімонтам III і Крыштофам Радзівілам прывяло да таго, што перад соймам 1598 г. апошні адкрыта пагражаў сарваць яго паседжанні [2, с. 294; 3, с. 270].

Аднак на сойме 1600 г. Жыгімонт III выразна змяніў сваю пазіцыю у дачыненні да Крыштофа Радзівіла, што было звязана з інкарпарацыяй Эстоніі і будучай вайной са Швецыяй. Ён заняў нейтральнае становішча ў канфлікце за слуцкую спадчыну, каб заручыцца падтрымкаю гетмана. Зрэшты, хутка кароль змяніў сваё меркаванне і параіў Пяруну перадаць камандванне над войскам Ежы Фарэнсбаху [3, с. 272; 7, с. 214].

Крыштоф Радзівіл усё ж узначаліў войска ВКЛ, якое мусіла бараніць Інфлянты ад шведаў і на тле гэтай вайны канфлікт паміж Жыгімонтам III і віленскім ваяводаю дасягнуў сваёй кульмінацыі. Ужо вясною 1601 г. Пяруна пачалі пры двары абвінавачваць у няўдачах вайны ў Інфлянтах [4, с. 268]. Яму закідалі выбар кепскіх ротмістраў для ротаў, якія на чале сваіх фармаванняў рабавалі мясцовых жыхараў, тое, што на абарону Інфлянтаў было выдадзена шмат грошай, а выніку гэта ніякага не прынесла, што татары былі пасланыя без водза. Таксама вялікага гетмана абвінавачвалі ў адсутнасці дысцыпліны ў войску, у нежаданні прымаць

кандыдатуру манарха на польнае пісарства і нават у раскраданні грошай [4, с. 267–271]. Жыгімонт III адмовіў Пяруну амаль ва ўсіх яго просьбах аб зямельных наданнях тым, хто паказаў сябе пад час каманіі з лепшага боку [4, с. 269; 5, с. 276–277, 279–280, 298–299, 312–313]. Не даваў згоды кароль і на высыланне дапамогі ў Інфлянты [5, с. 228]. У Вільне распаўсюджваліся чуткі, што Рубморк не быў узяты толькі таму, што не хацеў здавацца менавіта Крыштофу Радзівілу [5, с. 294].

Выглядае на тое, што значная частка гэтых абвінавачванняў не мела пад сабою падставаў, ці, прынамсі, часткова праблемы ў Інфлянтах былі вынікам палітыкі самаго манарха [5, с. 283–285]. У красавіку 1601 г. Жыгімонт III праз свайго пасланніка прапанаваў Пяруну адмовіцца ад узначальвання войска. Крыштоф Радзівіл гэтую прапанову праігнараваў. У канцы верасня 1601 г., з прыбыццем у Інфлянты кароннага гетмана Яна Замойскага і самаго Жыгімонта III, Пярун пакінуў войска і з'ехаў у ВКЛ. Вясною 1602 г. Войска ў Інфлянтах узначаліў Ян Караль Хадкевіч, галоўны супернік біржанскіх Радзівілаў што моцна закранула гонар Крыштофа Радзівіла [3, с. 271–272; 4, с. 166–168; 5, с. 298, 316–317].

Зімою 1603 г. Крыштоф Радзівіл з'явіўся на сойм, дзе разам з сынам Крыштофам II і Аляксандр Астрожскім рэзка выступіў у абарону правоў іншаверцаў, перад гэтым прэзентаваўшы Жыгімонту III 22 харугвы здабытыя ў Інфлянтах. У лістападзе гэтага ж году ён памёр пад час наведвання дачкі Эльжбеты ў Ласасінай пасля непрацяглай хваробы, застаючыся ў апазіцыі да манарха і адчуваючы на сабе яго моцную няласку. [3, с. 273–274]. Апазіцыю у дачыненні да палітыкі Жыгімонта III ў Вялікім Княстве Літоўскім узначалілі яго дзеці Януш і Крыштоф, а таксама пляменнік Ежы.

**Літаратура**


1. *Michalak H.* Jan Zamoyski a Radziwiłłowie. Od suplikanta do mentora // Miscellanea historico-archivistica. Warszawa, 1989. T. 3: Radziwiłłowie XVI-XVIII wieku. S. 217–233.
2. *Kempa T.* Mikołaj Krzyszof Radziwiłł Sierotka (1549-1616) wojewoda wileński. Warszawa : Semper, 2000.
3. *Lulewicz H.* Radziwiłł Krzysztof zwany Piorunem // Polski Słownik Biograficzny. Wrocław, 1987. T. 30. S. 264–275.
4. Archiwum Domu Radziwiłłów: Lista ks. M. K. Radziwiłła Sierotki-Jana Zamoyskiego-Lwa Sapiehy. Kraków, 1885.
5. Archiwum domu Sapiehów. T. 1. Listy z lat 1575-1606 / Wyd. A. Prochaska. Lwów, 1892.
6. *Lulewicz. H.* Radziwiłł Albrycht // Polski Słownik Biograficzny. Wrocław, 1987. T. 30. S. 135–140.
7. *Lulewicz H.* Walka Radziwiłłów z Chodkiewiczami o dziedzictwo słuckie // Miscellanea historico-archivistica. Warszawa, 1989. T. 3 : Radziwiłłowie XVI–XVIII wieku. S. 201–216.